| | |
|---|---|
| БЕШАНКОВІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ | БЕШЕНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ |
| АДДЗЕЛ ПА АДУКАЦЫІ | ОТДЕЛ ПО ОБРАЗОВАНИЮ |
| **ЗАГАД** | **ПРИКАЗ** |

21.08.2023 № 291
г.п. Бешанковічы
Віцебская вобласць

Аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага конкурсу творчых работ «Радзімы спадчына – мой гонар»

У адпаведнасці з планам работы аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама на 2023 год, на аснаванні палажэння аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага конкурсу творчых работ ’’Радзімы спадчына - мой гонар“, з мэтай стымулявання творчай і грамадскай актыўнасці навучэнцаў, духоўнага ўзбагачэння асобы навучэнца праз папулярызацыю гісторыка- культурнай спадчыны роднага краю, гістарычную пераемнасць пакаленняў
ЗАГАДВАЮ:

1. Арганізаваць і правесці з 21 жніўня па 15 верасня 2023 года раённы этап рэспубліканскага конкурсу творчых работ ’’Радзімы спадчына - мой гонар“ (далей – конкурс).

2. Зацвердзіць Умовы правядзення (Дадатак 1) і журы конкурсу (Дадатак 2).

3. Дырэктару дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі» Ючковіч А.В. забяспечыць падрыхтоўку і правядзенне конкурсу.

4. Кіраўнікам устаноў адукацыі:

4.1. забяспечыць удзел навучэнцаў і педагогаў устаноў адукацыі ў конкурсе;

4.2. прызначыць адказных за падрыхтоўку ўдзельнікаў у конкурсе;

5. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка начальніка аддзела па адукацыі А.Ц. Карбоўскую.

Начальнік аддзела М.В.Шыпуля

З загадам азнаёмлены:

А.Ц.Карбоўская
____________
С.Я. Баранок
____________
А.А. Галавенка
____________
У.У. Гаськоў
____________
В.Л. Красакова
____________
А.А.Шыпуля
____________
Н.М. Апанасёнак
____________
А.В. Ючковіч
____________

Дадатак 1

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка
аддзела па адукацыі
Бешанковіцкага райвыканкама
21.08.2023 № 291

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні раённага этапу
рэспубліканскага  конкурсу
творчых работ «Радзімы спадчына –
мой гонар»

## 1.АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Дадзенае палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага конкурсу творчых работ ’’Радзімы спадчына - мой гонар“ (далей - Конкурс).

1.2 Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца: аддзел па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама, дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі”.

1.3 Конкурс праводзіцца з 21 жніўня па 15 верасня 2023 года .

## 2.МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

1.4 Конкурс праводзіцца з мэтай стымулявання творчай і грамадскай актыўнасці навучэнцаў, духоўнага ўзбагачэння асобы навучэнца праз папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю, гістарычную пераемнасць пакаленняў.

1.5 Асноўнымі задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

фарміраванне гістарычнай свядомасці і высокай культуры грамадства;

развіццё творчага патэнцыялу, далучэнне навучэнцаў да пошукавай дзейнасці, накіраванай на даследаванне культурных традыцый роднага краю, жыццёвага і творчага шляху вядомых людзей малой радзімы;

папулярызацыя  імёнаў славутых землякоў сродкамі даследчай і мастацкай дзейнасці;

садзейнічанне зберажэнню культурнай спадчыны і народных традыцый.

## 3.УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

Удзельнікамі Конкурсу з’яўляюцца навучэнцы пад кіраўніцтвам педагогаў ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

## 4.ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца ў тры этапы:

першы этап (адборачны, жнівень - верасень 2023 года) - раённы/гарадскі;

другі этап (адборачны, жнівень - кастрычнік 2023 года) - абласны.

трэцці этап (заключны, лістапад 2023 года) - рэспубліканскі.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

*’’Скарбніца традыцый маіх дзядоў“;*

*’’Жывая крыніца талентаўроднага краю*

На Конкурс дасылаецца па 2 лепшыя работы у кожнай намінацыі.

1.6 У намінацыі *’’Скарбніца традыцый маіх дзядоў“* на Конкурс прадстаўляюцца творчыя работы, у якія ўваходзяць:

кароткія звесткі і матэрыялы аб культурна-гістарычных традыцыях малой радзімы і роднага краю аўтара;

выпіскі з пісьмовых крыніц, тэксты ўспамінаў, фотаздымкі;

прапановы аўтара па выкарыстанні звестак, атрыманых у ходзе падгатоўкі творчай работы, з мэтай фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і адраджэння духоўнай культуры.

Творчыя работы выконваюцца ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі фарматавання: аб’ём работы - не больш за 30 старонак фармату А4, тэкст работы друкуецца з дзвюх старонак ліста ў фармаце А4 з палямі: злева - 30 мм, справа - 10 мм, зверху і знізу - 20 мм у тэкставым рэдактары Word (не ніжэй Word 97), шрыфт - Times New Roman, размер шрыфта- 14 пт, міжрадковы інтэрвал - адзінарны.

Загалоўкі друкуюцца малымі літарамі (першая - вялікая). Старонкі неабходна нумараваць арабскімі лічбамі. Нумар старонкі прастаўляёцца на ніжнім полі старонкі па цэнтры.

Творчыя работы ў намінацыі *’’Скарбніца традыцый маіх дзядоў“* прадстаўляюцца ў друкаваным і электронным выглядзе.

1.7 У намінацыі *’’Жывая крыніца талентаў роднага краю"* на Конкурс прадстаўляюцца відэаматэрыялы (інтэрв’ю, відэасюжэты) аб дзейнасці земляка - сучаснага дзеяча беларускай культуры.

Пры падрыхтоўцы відэаматэрыялу аўтар выступае ў ролі рэжысёра,

аператара, сцэнарыста або карэспандэнта.

Патрабаванні да відэаматэрыялу: працягласць - да 5 хвілін, тэхнічныя параметры: фармат - avi, mpg, або wmv.

1.8 Агульныя патрабаванні да конкурсных творчых работ (для дзвюх намінацый):

творчыя работы суправаджаюцца інфармацыяй у фармаце *.docx або *.doc, якая ўключае:

тытульныя старонкі на рускай і беларускай мовах з пазначэннем поўнай назвы ўстановы адукацыі (без скарачэнняў), назвы конкурса/намінацыі, тэмы творчай работы, інфармацыі аб аўтары работы (прозвішча, імя, імя па бацьку, клас/аб’яднанне па інтарэсах) і аб кіраўніку (прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада), а таксама нумары кантактных тэлефонаў;

анатацыю творчай работы - апісанне ідэі, мэты, задач і характарыстыку зместа творчай работы, яе сацыянальную накіраванасць.

1.9 Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных творчых работ:

адпаведнасць умовам Конкурсу;

змястоўнасць, інфармацыйная напоўненасць;

творчасць, мастацкая прываблівасць, арыгінальнасць падачы матэрыялу.

## 5. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ І ПРЫЗЁРАЎ КОНКУРСУ

1.10 Сярод удзельнікаў раённага этапу конкурсу вызначаюцца пераможцы (1 месца) і прызёры (2, 3 месца) у кожнай намінацыі, якія узнагароджваюцца дыпломамі аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна.

1.11 Для ўдзелу ў раённым этапе Конкурсу да **15 верасня 2023 г.** прадстаўляюцца/дасылаюцца:

заяўка (дадатак 3), 2 лепшыя работы у кожнай намінацыі, інфармацыя аб творчай рабоце (глядзець пункт 4.4).

Творчыя работы у намінацыі ’’Скарбніца традыцый маіх дзядоў“ у друкаваным выглядзе дасылаюцца на адрас: 211361, г.п.Бешанковічы, вул. Валадарскага, д.18 і па электроннай пошце: cvr_beh@mail.ru з паметкай: ’’Радзімы спадчына - мой гонар“.

Творчыя работы ў электронным выглядзе ў намінацыях ’’Жывая крыніца талентаў роднага краю“ дасылаюцца па электроннай пошце: cvr_beh@mail.ru з паметкай: ’’Радзімы спадчына - мой гонар“.

Кантактны нумар тэлефона: 8 (02131) 4-13-74.

Дадатак 2

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка
аддзела па адукацыі
Бешанковіцкага райвыканкама
21.08.2023 № 291

Журы конкурсу:

1. А.В.Ючковіч – дырэктар ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»
2.Л.В.Гаралевіч – метадыст ДУ «Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет»
3.Т.У.Дземідавец - метадыст ДУ «Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет»
4.Г.В.Бучмінская – метадыст ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»
5.А.Р.Бабарэнь – педагог-арганізатар ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»

Дадатак 3

ЗАЯЎКА
на ўдзел у конкурсе творчых работ
’’Радзімы спадчына - мой гонар“

(на беларускай мове)

| № п/п | Намінацыя | Назва работы | Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтар | Установа адукацыі, клас/аб’яднанне па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка, месца працы, пасада, кантактны нумар тэлефона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | |

(на русском языке

| № п/п | Номинация | Название работы | Ф.И.О. автора | Учреждение образования, класс/объединение по интересам | Ф.И.О. руководителя, место работы, должность, контактный номер телефона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | |